
ДА ЎРАЧА — БЕЗ ТАЛОНАЎ І ЗАПІСУ 7

І МАЎЧАННЕ — ЗБРОЯ 12


Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

2 ВЕРАСНЯ 2020 г. СЕРАДА № 170 (29284)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Раман ГАЛОЎЧАНКА, прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь:**

*«Вельмі важна, каб прадпрыемствы больш актыўна працавалі на рынкі Еўропы. Для нас гэта вельмі сур'ёзная задача, хоць пакуль не ўдаецца вырашыць яе так хутка, як хацелася б. Каб прадукцыя прадпрыемстваў была адпаведнай якасці, неабходна інвеставаць у абсталяванне і тэхналогіі, праходзіць сертыфікацыю. Мы мэтанакіравана рухаемся ў гэтым напрамку, гэта наша мэтавая ўсталёўка, а не дыверсіфікацыя дзеля дыверсіфікацыі. Бо выхад на рынак краін Еўрасаюза азначае, што гэта прадукцыя высокатэхналагічная і канкурэнтаздольная. Калі яна прадаецца там, яна будзе прадавацца ўсюды».*

# ДАРОГА Ў КРАІНУ ВЕДАЎ





1 верасня ў віцебскім мікрараёне Білева-2 урачыста адкрыта новая сярэдняя школа № 47 імя генерала Я.Ф. Іваноўскага. СТАР. 3

Фота БелТА.

## КОРАТКА

- **Кіраўнікі МЗС Беларусі і Канады абмеркавалі перспектывы ўзаемадзеяння.**
- «Вялікі камень» увайшоў у інавацыйны альянс адмысловых эканамічных зон свабоднага гандлю.
- **Беларусь і Расія дамовіліся аб паэтапным аднаўленні транспартных зносін.**
- Нацбанк запусціў абноўленую версію адзінага партала фінансавай адукацыі.
- **Новы Кодэкс аб адукацыі плануюць восенню ўнесці на разгляд у парламент.**
- СААЗ паставіла ў прыклад шведскую стратэгію барацьбы з каранавірусам.
- **Сезон палявання на бабра і выдру адкрыўся ў Беларусі.**

ДЗЕНЬ БЕЛАРУСКАГА ПІСЬМЕНСТВА

Міхась КАРПЕЧАНКА:

## «У ДУШЫ Я — КРАЯЗНАВЕЦ»

**Рэдактар бялыніцкай раённай газеты «Зара над Друццю» падрыхтаваў да Дня беларускага пісьменства некалькі літаратурных навінак.**

**Калі падымалася на другі паверх у рэдакцыю бялыніцкай раёнкі, звярнула ўвагу на незвычайную лесвіцу. На кожнай прыступцы пазначаны імёны журналістаў, якія працавалі ў выданні і ўжо пайшлі з жыцця. Такім чынам Міхась Карпечанка вырашыў захаваць памяць пра сваіх папярэднікаў. Дзякуючы яго ініцыятыве ў горадзе з'явілася мемарыяльная дошка мясцоваму паэту Віктару Хаўратовічу. Напярэдадні Дня беларускага пісьменства ў розных сталічных выдавецтвах выйшла ажно тры кнігі гэтага аўтара, дзе ён праслаўў вядомых ураджэнцаў Бялыніччыны, прасачыў развіццё рэлігійнага руху і склаў зборнік мясцовых аўтараў. Кнігі будуць прэзентаваны падчас вялікага літаратурнага свята, якое адбудзецца ў Бялынічах 6 верасня. Сёння Міхась Аляксеевіч толькі крыху прыадкрывае іх змест і шляхі стварэння.**



СТАР. 8

Спорт-тайм

## РОЛЕР-СПОРТ БЕЗ УЗРОСТУ І АБМЕЖАВАННЯЎ

**Калі лічыць, што прафесійны спорт пачынаецца са стварэння нацыянальнай федэрацыі, то ролер-спорт у нашай краіне занадта малады. Беларуская федэрацыя спорту на роліках і скейтбордах была створана ў 2017 годзе. Але яго гісторыя пачалася значна раней.**

СТАР. 9



ISSN 1990 - 763X

20170>

9 771990 763008

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

Пачалася падпіска на «Звязду» на IV квартал 2020 года

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА